Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

25 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СЕРАДА № 16 (28380)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Адраснае крэдытаванне жылля

СТАР. 3

Мясцовае Самакіраванне

Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

СТАР. 5-12



Нейрахірургія супраць эпілепсіі

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:**

*«Дэкрэт Прэзідэнта «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрымáнства» паступіў у парламент. Прапанаваныя ў дакуменце змяненні ідуць ад самога жыцця. Карэкціроўкі ўнесены з улікам правапрымяняльнай практыкі і прадыктаваны сучаснымі рэаліямі. Для таго каб зразумець прапанаванае, неабходна ў першую чаргу задаць сабе пытанне: дзе дзяржава бярэ грошы на фінансаванне ўсіх жыццёва важных для чалавека сфер і як я ў гэтым удзельнічаю? Той падыход, што фінансаваць дзяржаўныя выдаткі павінен кожны, — правільны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9310 | ▼ |
| Еўра | 2,0746 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# У ГОСЦІ ДА СКАРЫНЫ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Тацянін дзень адзначае сёння і Таццяна Сапега. Больш за паўтара дзесяцігоддзя працуе яна ў Нацыянальнай бібліятэцы, дзе ўзначальвае сектар навукова-праектнай работы. Летась у бібліятэцы распачалася культурна-асветніцкая ініцыятыва для дзяцей і школьнікаў пад назвай «У госці да кніг». Яна прысвечана 500-гадоваму юбілею беларускага кнігадрукавання. Таццяна Сапега з'яўляецца адным з аўтараў гэтага надзвычай актуальнага праекта.**

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## «ДНО МНОГІХ ВАДАЁМАЎ ПЕРАТВОРАНА Ў СМЕТНІК»

### У чым сакрэты работы вадалазаў?

**Гісторыя гэтая разыгралася неяк летнім вечарам у Мінску. Каля Лошыцкага парку ёсць участак, дзе хавалася старое русла Свіслачы і ўтвораныя там невялікія азёры. Ды і мясцовасць навокал глухаватая — усё зарасло лазой і дзікім вінаградам...**

**Вадалазаў там сустрэў мясцовы ўчастковы міліцыянер. Пакуль яны ішлі да месца падзей і збіралі рыштунак, ён расказаў страшную гісторыю.**



Кампанія зладзіла пікнік на беразе ракі. Нехта прыхапіў з сабой малога гадоў 10. Ён нібыта адышоў на метраў 50 убок і ўбачыў азярцо, у якім тануў чалавек. А на супрацьлеглым беразе стаяў нейкі змрочны тып. Апрануты ён быў у шэрую куртку з насунутым на галаву капюшонам. Хлопчык спужаўся і пабег да бацькоў. А незнаёмы — у іншы бок.

А цяпер увявіце сабе навакольную атмасферу. Гаснуць апошнія промні сонца. Імкліва цямнее. І вада здаецца чырвонай. Міліцыянер гаворыць: напэўна, гэта кроў... Першым з вадалазаў у гэтае азярцо зрабіў крок камандзір аддзялення. І тут жа схаваўся з галавой у вадзе.

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

## ЯКІМ БЫЦЬ ПАДМІКОЛЛЮ?

### У Магілёве сышліся на тым, што ў парку не будзе фестывальнай пляцоўкі і гандлёвага цэнтра

**Сёлета павінен быць зацверджаны генеральны план развіцця Магілёва да 2025 года. Яго грамадскае абмеркаванне закончылася яшчэ летась, але ўсё яшчэ існуюць спрэчныя пытанні па Падміколлі — адной з гістарычных зон горада, дзе цяпер ствараецца гарадскі парк. Рэспубліканскі архітэктурна-горадабудаўнічы Савет пры Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва параіў Магілёўскаму гарвыканкаму правесці круглы стол для выпрацоўкі канкрэтных рашэнняў па развіцці названай тэрыторыі. Удзел у ім прынялі дэпутаты гарсавета, прадстаўнікі Магілёўскага аблвыканкама, Свята-Мікольскага жаночага манастыра і грамадскасці.**

СТАР. 4



Фота Алеся САБАЛЕЎСКАГА.